5. Там же. С. 42.
6. Сяменчык М. Я. Дэмакратызацыя грамадска-палітычнага жыцця і рэцыдывы антысемітызму на Беларусі (вясна—восень 1917 г.) // Труды БГТУ. Сер. V. Политология, философия, история, филология. 2004. Вып. XII. С. 7—14.
7. Сяменчык М. Я. Нацыянальныя рухі на Беларусі ў кантэксце фарміравання новай палітычнай сістэмы (сакавік—кастрычнік 1917 г.) // Славянскі свет: мінулае і сучаснае : матэрыялы рэсп. навук. канф., 26 сак. 2004 г. : у 2 ч. Мінск, 2004. Ч. 1. С. 226—233.
8. Сяменчык М. Я. Польскія вайсковыя арганізацыі і фарміраванні на Беларусі ў 1917-1918 гг. // Праблемы айчыннай і сусветнай гісторыі (да 60-годдзя доктара гістарычных навук, прафесара У. М. Міхнюка) : матэрыялы навук. чытанняў, г. Брэст, 28 верасня 2007 г. ; Брэсц. дзярж. ун-т імя А. С. Пушкіна. Брэст : Выд-ва БрДУ, 2008. С. 139—150.
9. Сяменчык М. Я. Грамадска-палітычнае жыццё на Беларусі ў перыяд Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый (сакавік 1917 — сакавік 1918 гг.). С. 45, 166.
10. Там же. С. 113.
11. Там же. С. 126—129.
12. Там же. С.75.
13. Сяменчык М. Я. Рэфармацыйныя і рэвалюцыйныя змены на Беларусі (сакавік—кастрычнік 1917 г.) // Труды БГТУ. Сер. V. История. Философия. Филология. 2012. № 5 (162). С. 41—45
14. Сяменчык М. Я. Наступальная кампанія рускай арміі 1917 года ў лёсе Лютаўскай рэвалюцыі // Труды БГТУ. Сер. V. Философия, история, филология. 2011. № 5(143). Вып. XVIII. С. 33—36.
15. Сяменчык М. Я. Аб стане законнасці і правапарадку на Беларусі ў кантэксце рэвалюцыйнага абнаўлення расійскага грамадства ў сакавіку 1917 г. // Труды БГТУ. Сер. V. Политология, философия, история, филология. 2008. Вып. XVI. С. 97—101.
16. Сяменчык М. Я. Грамадска-палітычнае жыццё на Беларусі ў перыяд Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый (сакавік 1917 — сакавік 1918 гг.). С. 172.
17. Там же. С. 113.
18. Семенчик Н. Е. Деятельность большевиков Беларуси в марте—октябре 1917 г. // Отечественная наука в эпоху изменений: постулаты прошлого в теории нового времени : материалы V Междунар.науч.-практ. конф., 5—6 дек. 2014 г. Екатеринбург. 2014. С. 141—143.
19. Семенчик Н. Е. Становление и крах революционной демократии в Беларуси // Труды БГТУ. Сер. V. История. Философия. Филология. 2015. № 5 (169). С. 21—24.

УДК 940.5(476)

**А. Г. Трубчык**
*Дзяржаўная навуковая ўстанова «Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі», Мінск*

# АСНОЎНЫЯ КІРУНКІ І АСАБЛІВАСЦІ ДЗЕЙНАСЦІ ПОЛЬСКАЙ ГРАМАДЗЯНСКАЙ АДМІНІСТРАЦЫІ НА БЕЛАРУСКАЙ ТЭРЫТОРЫІ Ў ЧАС ПОЛЬСКА-САВЕЦКАЙ ВАЙНЫ (1919—1921 ГГ.)

**Уводзіны.** Аб дзейнасці польскай грамадзянскай адміністрацыі на беларускай тэрыторыі ў 1919—1921 гг. сведчаць ліквідацыйныя рапарты, якія з'яўляюцца найболыш каштоўнай крыніцай па вывучэнню дадзенага пытання. Аналіз рапартаў і справаздач польскай грамадзянскай адміністрацыі дазваляе сфарміраваць аб'ектыўную карціну тагачасных падзей, запоўніць некаторыя «белыя плямы», перагледзець спрэчныя пытанні, якія і сёння існуюць у айчыннай і польскай гістарыяграфіі. Ажыццяўленне палітыкі на беларускіх землях разыходзілася з кірункам, дэкларавaным Ю. Пілсудскім. Сучасныя польскія даследчыкі тлумачаць гэта як вынік дзейнасці мясцовай адміністрацыі. Так, вядомы спецыяліст па пытаннях польскай палітыкі ў 1919—1921 гг. Ю. Гіероўска-Калаўр лічыць, што мясцовыя чыноўнік мелі магчымасць праводзіць незалежную ад Варшавы палітыку ва ўсіх сферах грамадскага жыцця, што прадвызначыла адхіленне ад федэралісцкай лініі.

Мэтай дадзенага артыкула з'яўляецца вызначэнне асаблівасцей і асноўных накірункаў дзейнасці польскай грамадзянскай адміністрацыі на беларускіх землях у перыяд польска-савецкай вайны (1919—1921 гг.).

**Асноўная частка.** Пасля абвяшчэння адозвы Ю. Пілсудскага «Да жыхароў былога Вялікага княства Літоўскага» на тэрыторыі, занятай польскімі войскамі, было створана Грамадзянскае ўпраўленне Усходніх зямель (далей — ГУУЗ). Генеральны камісар быў адказны перад Галоўным камандаваннем, ажыццяўляў заканадаўчую і выканаўчую ўладу ва ўсіх сферах грамадскага жыцця (акрамя вайсковых спраў), назначаў і звальняў чыноўнікаў, кантраляваў бюджэт ГУУЗ, падатковую сістэму і інш. [1]. Генеральны камісарыят складаўся з чатырох секцый (агульных спраў, адміністрацыйнай, гаспадарчай, фінансавай), якія падзяляліся на 14 аддзелаў (агульны, юстыцыі, агітацыйны, адміністрацыі, веравызнанняў і прэсы, аддзел кадраў, здароўя, асветы і культуры, дзяржаўных багаццяў, фінансаў, зямельны, рамяства і гандлю, эканамічны, кантралюючы аддзел).

28 мая Е. Асмалоўскі выдаў распараджэнне аб арганізацыі акруг і акруговых улад на «ўсходніх землях» [2]. У склад кіраўніцтва акруг, акрамя камісара, уваходзілі яго намеснік, а таксама група інспектараў. 7 чэрвеня былі ўтвораны Віленская і Брэсцкая акругі, 12 верасня — Мінская акруга [3].

З 10 кастрычніка акруговыя камісары былі перайменаваны ў начальнікаў акруг. 5 лістапада намеснік Генеральнага камісара Эдвард Івашкевіч выдаў распараджэнне аб утварэнні паветаў і павятовай адміністрацыі. Павятовыя камісары пачалі называцца старастамі [4]. З гэтага часу дзейнасць Генеральнага камісарыята не кантралявалася з боку Галоўнага камандавання (канчаткова залежнасць ад вайсковых улад была скасавана пастановамі Сейма ад 25 лістапада і 19 снежня 1919 г.).

© Трубчык А. Г., 2016

Рэпазіторый БарДУ

Ажыццяўленне палітыкі ГУУЗ з самага пачатку значна разыходзілася з федэралістычным накірункам, дэклараваным Ю. Пілсудскім. Гэтаму спрыяў шэраг фактараў: большасць мясцовых чыноўнікаў арыентаваліся на Польшчу, чакаючы правядзення аграрнай рэформы, праект якой абмяркоўваўся ў Сейме; генеральны камісарыят ГУУЗ меў магчымасць збіраць падаткі з мясцовага насельніцтва, што абумоўлівала пэўную фінансавую незалежнасць ад Польскай дзяржавы; слабасць і раз'яднанасць беларускага нацыянальнага руху; апалітычнасць мясцовага насельніцтва, адсутнасць грамадскай актыўнаці, размытая этнічная ідэнтыфікацыя.

Неабходна адзначыць, што палітыка польскіх улад значна адрознівалася не толькі ў акругах, але і на ўзроўні паветаў. Найбольш лаяльна і асцярожна адміністрацыя ГУУЗ паводзіла сябе на Міншчыне.

За падтрымку польскай улады выступала большая частка мясцовых землеўласнікаў, якія чакалі аграрнай рэформы і атрымання ва ўласнасць новых зямельных абшараў. У лістападзе 1919 г. у афіцыйным урадавым выданні "Wschódpolski" быў надрукаваны ліст, які даслалі Ю. Пілсудскаму адразу пасля заняцця Мінска польскімі войскамі прадстаўнікі Мінскага таварыства землеўласнікаў з ксяндзом Лазіцкім. Выступаючы ад імя мінскага грамадства, аўтары выказалі пажаданне, каб «польскія войскі здабылі ўсю тэрыторыю ад Дзвіны да Дняпра» [5]. Каб не толькі атрымаць, але і захаваць дадзеныя землі, польскаму ўраду раілася наступнае: стварыць моцную адміністрацыю, якая будзе прытрымлівацца выразнай палітычнай лініі; акрамя сваёй сілы, польскае кіраўніцтва павінна дэманстраваць справядлівасць і талерантнасць; неабходна забяспечыць насельніцтва харчаваннем, наладзіць шляхі зносін, гандаль; трэба стварыць рэальную апеку над сельскай гаспадаркай, падтрымліваць гаспадароў, паляпшаць агракультуру і г. д.; адразу ж неабходна прыступіць да працы ў галіне асветы і культуры (маецца на ўвазе развіццё польскіх школ і культурных устаноў — ***А. Т.***). Разам з тым прызнаваўся факт, што на Міншчыне большасць насельніцтва мае слабую грамадскую свядомасць і не адразу падтрымае польскую ўладу. Таму падрыхтоўку да плебісцыту на Міншчыне трэба адкласці да тых пор, пакуль не будзе ўпэўненасці ў яго станоўчым выніку [6].

13 жніўня 1919 г. было арганізавана Мінскае староства на чале з камісарам Багданам Грушкевічам і намеснікам Ольгердам Даніловічам. Урад староства складаўся з наступных аддзелаў (рэфератаў): агульнай канцылярыі, бухгалтэрыі, адміністрацыйнага, паліцыі, сельскай гаспадаркі, аправізацыі, тэхнічнага, санітарнага, ветэрынарнага, міграцыйнага, асветы, гандлю і прамысловасці, самакіравання. У склад адміністрацыі староства ўваходзіла 22 чыноўнікі, большасць з якіх былі буйнымі землеўласнікамі мясцовага паходжання, арыентаванымі на Польшчу.

12 верасня намеснік Генеральнага камісара падпісаў загад аб утварэнні Мінскай акругі, у склад якой увайшлі Мінскі, Барысаўскі, Бабруйскі, Ігуменскі, Слуцкі і Лепельскі паветы, якія падзяліліся на 29 раёнаў і 98 гмін.

Горад Мінск з'яўляўся асобнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкай на чале з камісарам. Службу бяспекі ў горадзе і павеце выконвала жандармерыя (186 жандармаў), а таксама паліцыя. Паліцэйскія ажыццяўлялі канвой, перавозку арыштаваных, перадачу вязняў, прысутнічалі пры правядзенні следства. Па дадзеных аддзела паліцыі, з 20 жніўня 1919 г. па 10 ліпеня 1920 г. у Мінску было здзейснена 172 адміністрацыйных пакаранні на агульную суму 69 878 марак, і толькі 3 чалавекі былі арыштаваныя па палітычных матывах [7]. Неабходна падкрэсліць, што паліцыя афіцыйна падпарадкоўвалася ГУУЗ і ўтрымлівалася за яго кошт. Накіраванне прафесійных паліцэйскіх на беларускія тэрыторыі з Польшчы пачалося з канца жніўня 1919 г. Планавалася паступовая замена жандармерыі, злачынная дзейнасць якой спрыяла фарміраванню негатыўнага вобразу польскай улады ў вачах мясцовага насельніцтва.

У верасні 1919 г. у Мінскім павеце быў утвораны часовы земскі ўрад на чале з старшынёй Ольгердам Свідай. У склад адміністрацыі самакіравання, акрамя старшыні, уваходзілі кіраўнікі санітарнага, падатковага і школьнага аддзелаў, бухгалтар, справавод, машыністка [8]. На ўтрыманні земства знаходзіліся 62 школьныя будынкі, 3 шпіталі, дзіцячы прытулак, некалькі двухпавярховых жылых дамоў у Мінску. Сродкі накіроўваліся таксама на ветэрынарнае абслугоўванне, рамонт дарог, будынкаў і інш. У справаздачах старшыні земскай адміністрацыі адзначалася, што праца органаў самакіравання развіваецца вельмі павольна з-за слабага паступлення падаткаў. Немагчыма было хутка наладзіць сістэму падаткаабкладання ва ўмовах ваеннага часу, акрамя таго Генеральны камісарыят не дазваляў аказваць націск на абяздоленае мясцовае насельніцтва і падвяргаць яго рэпрэсіям. Першыя падатковыя лісты былі разасланыя толькі ў снежні (праз чатыры месяцы пасля арганізацыі самакіравання), аднак польскім уладам да ліпеня 1920 г. удалося атрымаць праз мясцовае самакіраванне менш за палову запланаваных сродкаў. Грошы, пазычаныя ў Генеральнага камісарыята (1 100 000 марак), Польскай школьнай рады (42 749 марак), кіраўніцтва Мінскай акругі (150 000) таксама не вярнуліся [9].

15 жніўня 1919 г. пры адміністрацыі староства быў арганізаваны зямельны аддзел, кіраўніком якога стаў Тадэвуш Цішкевіч. Праца пачалася са збору статыстычных дадзеных: праводзіўся перапіс сельскіх гаспадарак, цяглавай жывёлы, сельскагаспадарчай тэхнікі і забудоў. У кожную гміну было накіравана па два чыноўнікі, якія за два месяцы завяршылі дадзеную справу.

У планах польскіх улад была дапамога сельскаму насельніцтву ў дастаўцы цяглавай жывёлы, насення, гаспадарчых прылад, арганізацыя сельскагаспадарчых кааператываў, аграрных школ. Прадстаўнікі Галоўнай апякунскай рады і таварыства стражы крэсовай заняліся арганізацыяй лекцый, тэматыка якіх была накіравана на распаўсюджваннне агракультурных ведаў сярод мясцовых гаспадароў [10].

За першы месяц існавання зямельнага аддзела ў Мінскім павеце было створана 6 сельскагаспадарчых кааператываў, аднак іх дзейнасць абмяжоўвалася толькі размеркаваннем насення ў час пасяўной кампаніі. Для падтрымкі мясцовых аграрыяў вясной 1920 г. зямельны аддзел выдзяліў 173 пуды пшаніцы, 25 520 пудоў аўса, 5 338 пудоў ячменю, 535 пудоў серадэлы, 2 185 пудоў вікі і 58 пудоў гароху. Насенне прадавалася па цэнах, якія былі значна ніжэй за рынкавыя. Ніякай іншай дапамогі або пазыкі сельскагаспадарчым кааператывам з боку польскіх улад не было зроблена [11].

Разам з тым ад мясцовага насельніцтва патрабавалася забеспячэнне польскага войска харчаваннем, коньмі, адзеннем і г. д. Да 1 красавіка 1920 г. у вайсковы аддзел было пастаўлена 65 000 пудоў сена, 120 000 пудоў саломы,



Репозиторий БарГУ

75 000 пудоў бульбы, закупленых ў мясцовага насельніцтва па заніжаным цэнам. У лютым 1920 г. была створана спецыяльная камісія, якая займалася арганізацыяй збору збожжа. У склад камісіі ўваходзіў староста, а таксама прадстаўнікі ад буйных, сярэдніх і дробных землеўласнікаў. У павеце з прадстаўнікоў мясцовага насельніцтва было створана 15 гмінных камісій на чале з войтамі. На карысць войска было сабрана 116 419 пудоў збожжа. Для параўнання: закуплена было 8 210 пудоў ячменю па цане 35 фенінгаў за пуд, а вясной была аказана «дапамога» насеннем па цане 80 марак за пуд [12]. Ашуканымі засталіся гаспадары і ў час акцыі па пастаўцы мяса-малочнай жывёлы ў войска. У насельніцтва было закуплена каля 5 000 кароў і свіней на агульную суму 7 525 279 марак, аднак 1 151 181 марку польскае кіраўніцтва не здолела выплаціць [13].

Дзейнасць павятовага санітарнага аддзела пачалася 15 жніўня. Мінскі павет быў падзелены на 6 медыцынскіх раёнаў, у якіх было арганізавана восем фельчарскіх і два акушэрскія пункты. Бясплатная медыцынская дапамога аказвалася бяднейшаму насельніцтву, дзецям і пацыентам з цяжкімі інфекцыйнымі захворваннямі. Для астатніх катэгорый насельніцтва адзін амбулаторны прыём каштаваў 2 маркі, а дзень лячэння ў стацыянары — да 5 марак. Усе сродкі, атрыманыя ад лячэння хворых, перадаваліся ў кіраўніцтва земскага самакіравання, якое за гэты кошт павінна была ўтрымліваць медыцынскі персанал.

Галоўным прадстаўніком медыцынскай улады ў павеце з’яўляўся павятовы ўрач, пры якім працавалі пяць фельчараў (тры спецыялізаваліся па эпідэмічных захворваннях — «дэзінфектары»). Пры кожным шпіталі працавалі: урач, два фельчары, акушэрка і два дэзінфектары. Акрамя таго, у павеце афіцыйна працавалі тры ўрачы, шэсць акушэрак і два дантысты прыватнай практыкі. Задачай медыцынскай службы з’яўлялася барацьба з інфекцыямі, якія ва ўмовах ваеннага часу набылі катастрафічныя маштабы. Праводзілася дэзінфекцыя жылых дамоў і грамадскіх устаноў. З-за недахопу фельчараў медыцынскія праверкі школьнікаў і выхаванцаў дзіцячых дамоў ускладаліся на настаўнікаў. Для лячэння вязняў быў арганізаваны спецыяльны паліцэйска-медыцынскі нагляд. Кабінеты прыватных урачоў таксама правяраліся на адпаведнасць санітарным нормам. Для барацьбы з венерычнымі захворваннямі ў Мінску была арганізавана работа спецыялізаванага шпіталя (лячэнне атрымалі больш за 200 чалавек) [14].

Асобнай сферай дзейнасці польскіх улад з’яўлялася культурная і адукацыйная палітыка. З часоў нямецкай акупацыі на Міншчыне засталася значная колькасць беларускіх школ, і з гэтым польская ўлада не магла не лічыцца, акрамя таго, асабліва з восені 1919 г., менавіта тут былі сканцэнтраваны асноўныя сілы беларускага нацыянальнага руху. На Міншчыне захавалася традыцыя мясцовага самакіравання, якая цягнулася яшчэ з былых расійскіх часоў, таму школы былі перададзеныя на ўтрыманне Мінскага магістрата, грамадскіх арганізацый, павятовых і гмінных рад. Па сутнасці, адукацыйныя ўлады на Міншчыне апынуліся па-за межамі сваіх непасрэдных абавязкаў, іх функцыі абмяжоўваліся толькі кантролем за дзейнасцю школ, ажыццяўляць які з-за адсутнасці транспартных сродкаў, фінансаў і аўтарытэту аказалася амаль немагчыма. Ні адзін з павятовых школьных інспектаратаў не быў цалкам ўкамплектаваны працаўнікамі: часцей за ўсё працаваў толькі інспектар і сакратар, якія адначасова па меры магчымасці выконвалі абавязкі рэвізораў. Нават у акруговым інспектараце рэвізорам агульнаадукацыйных школ працаваў школьны інспектар Бабруйскага павета, а рэвізорам сярэдніх школ — сакратар інспектарата [15].

У сакавіку 1920 г. на ўтрыманні магістрата знаходзілася 39 пачатковых (19 беларускіх, 7 яўрэйскіх, 9 рускіх, 3 польскія і 1 татарская школа) і 6 вышэйшых пачатковых школ, беларуская гімназія, гандлёвая школа, школы сляпых і глуханямых дзяцей [16]. Асноўная частка польскіх школ на Міншчыне працавала пры падтрымцы Польскай школьнай рады, якая атрымлівала сродкі ад ГУУЗ. З гэтай жа крыніцы здабывала сродкі і Беларуская школьная рада, якая аб’явіла сябе апякуном беларускіх школ. Абедзве Рады дэманстравалі незалежнасць ад акруговых і павятовых школьных улад.

Націск на беларускія школы пачаў адчувацца з пачатку 1920 г., калі на месца акруговага школьнага інспектара Мечыслава Каўса, які падаў у адстаўку, быў назначаны Люцыян Квек. Новы кіраўнік накіраваў да Секцыі асветы ГУУЗ сакрэтны ліст, у якім выказаў сваё незадавальненне ажыццяўленнем школьнай справы на Міншчыне і выказаў шэраг уласных прапаноў. Школьны інспектар падкрэсліваў, што школьная справа на Міншчыне павінна служыць асноўным палітычным мэтам Польскай дзяржавы — далучэнню гэтых зямель да Польшчы. Па яго меркаванні, неабходна было прыняць усе школы на дзяржаўнае ўтрыманне: польскія — каб забяспечыць іх развіццё, а астатнія — каб паставіць пад поўны кантроль ад улад. Асаблівую пагрозу бачыў з боку беларускіх школ, колькасць якіх павялічвалася за кошт скарачэння колькасці рускіх. Падтрымка рускіх школ магла б знізіць незадаволенасць з боку рускіх настаўнікаў, якія засталіся без сродкаў да існавання, і адцягнуць увагу насельніцтва ад беларускага нацыянальнага руху. Беларускія і рускія школы неабходна паступова пераўтвараць у польскія са згоды мясцовага насельніцтва. Для ўзмацнення польскіх школ на Міншчыне неабходна «сілай накіраваць сюды настаўнікаў з Польшчы» [17]. У час эвакуацыі на Міншчыне налічвалася прыкладна 1 120 агульнаадукацыйных школ (327 польскіх, 233 беларускіх, 537 рускіх, 23 яўрэйскіх), 77 сярэдніх школ (16 польскіх, 2 беларускія, 51 руская і 31 яўрэйская) і 15 прафесійных навучальных устаноў (3 польскія і 12 рускіх) [18].

Арганізацыя культурна-асветных устаноў з’яўлялася часткай плану па падрыхтоўцы Міншчыны да будучага плебісцыту. Стараннямі таварыства стражы крэсовай у Мінскім павеце дзейнічалі дзве арганізацыі моладзі, народны дом і дзве бібліятэкі [19]. У Мінску выдаваліся афіцыйныя польскамоўныя выданні “Zorza Mińska”, “Goniec Miński” і часопіс для дзяцей “Mój Światek”.

На жаль, у час эвакуацыі шэраг рапартаў і справаздач засталіся ў Мінску і, хутчэй за ўсё, згарэлі, сярод іх дакументацыя міграцыйнага, тэхнічнага, ветэрынарнага аддзелаў.

Адным з важнейшых кірункаў палітыкі ГУУЗ была падтрымка дзейнасці польскіх дабрачынных грамадскіх арганізацый, сярод якіх найбольш моцнай з’яўлялася Галоўная апякунская рада (далей — ГАР), арганізаваная ў Варшаве ў канцы снежня 1915 г. Згодна са статутам, які быў зацверджаны 1 студзеня 1916 г. нямецкімі

Рэпазіторый БарДУ

акупацыйнымі ўладамі, ГАР з’яўлялася арганізацыяй грамадскай самадапамогі, галоўнай мэтай якой была апека над пацярпелым ад вайны насельніцтвам без розніцы веравазнання. Падкрэслівалася, што «для дасягнення гэтай мэты выключаецца любая палітычная дзейнасць» [20]. Асноўную ўвагу рада надавала падняццю агракультурнага ўзроўню прыватных гаспадарак, ўтрыманню дзіцячых дамоў, прытулкаў для дарослых, сталовак, арганізацыі раздачы адзення бяднейшаму насельніцтву, падтрымцы школ і розных культурна-асветных устаноў.

З першых дзён вайны на занятых польскімі войскамі беларускіх землях пачалі ствараццa павятовыя, гарадскія і гмінныя апякунскія рады, якія дзейнічалі вельмі актыўна і эфектыўна. У красавіку 1919 г. у складзе Цэнтральнай рады ў Варшаве з’явіўся новы аддзел — «Усходніх крэсаў», які складаўся з кіраўніка Зянона Руткоўскага, памочніка Юзэфа Класоўскага і інструктараў наступных секцый: статыстычнай, фінансавай, аправізацыі, справаздачнай, секцыі асабістага складу, секцыі архіваў і дзённікаў, секцыі кантролю над апякунскімі радамі [21].

ГАР была першай польскай грамадскай арганізацыяй, якая звярнула ўвагу на тое, што неабходна не толькі весці барацьбу з бальшавікамі, але і «здабыць сэрцы мясцовага насельніцтва». Рада намагалася пераканаць польскі ўрад у тым, што грамадская апека мае «важнае палітычнае значэнне, бо можа ўзмацніць прыхільнасць да польскай дзяржаўнасці насельніцтва, разрабаванага папярэдняй нямецкай і бальшавісцкай акупацыямі» [22]. У сакавіку 1919 г. рада накіравала ў Брэст два вагоны мукі, а таксама склала праект бюджэту на красавік і май у памеры 35 млн марак для разгортвання сваёй дзейнасці ў беларускіх паветах. У тлумачальным лісце да міністра працы і апекі адзначалася, што гэта даволі значная сума апраўдае сябе ў будучым, калі польская акцыя будзе развівацца ў двух кірунках: вяртанне страчаных тэрыторый і атрыманне прыхільнасці з боку мясцовага насельніцтва [23].

Для арганізацыі павятовых апякунскіх радаў на беларускія землі накіроўваліся працаўнікі ГАР, якім адаваліся пасады сакратароў. У склад кожнай павятовай апякунскай рады ўваходзілі дэлегаты і інструктары (інструктар-выхаваўца, часцей за ўсё выконвалі гэтыя абавязкі жанчыны, і інструктар-лекар). З палітычнага пункту гледжання мэтай ГАР прызнавалася неабходнасць ахапіць як мага большай апекай тэрыторыі ГУУЗ, дзяржаўны апарат якога лічыўся вельмі слабым: «адміністрацыя таго краю прыслана з мясцовасці, якая мае зусім іншую культуру, не знаёмая з мясцовымі умовамі, не ведае мясцовай мовы, не можа справіцца і думае або аб звальненні з пасад, або проста назірае за пануючым на Гродзеншчыне і Міншчыне бязладдзем» [24].

Адным з важнейшых кірункаў дзейнасці ГАР на беларускіх землях было паляпшэнне гаспадарчага жыцця краю. У красавіку 1919 г. была арганізавана спецыяльная камісія, якая першапачаткова працавала пад эгідай ГАР, але потым была прызнана кіраўніцтвам ГУУЗ як самастойная арганізацыя пад назвай «Камітэт адбудовы крэсаў». Ад Е. Асмалоўскага гэты камітэт атрымаў адзінаразовую дапамогу ў памеры 3 млн марак на кожны павет (усяго 54 млн марак). Для атрымання фінансавання камітэт падтрымліваў сувязі і супрацоўнічаў з іншымі грамадскімі, гаспадарчымі і ўрадавымі арганізацыямі. У склад камітэта ўваходзілі прадстаўнікі ад ГАР, Камітэта абароны крэсаў, Галоўнай народнай рады Гродзеншчыны, Віленскага зямельнага таварыства, Мінскага зямельнага таварыства і інш. [25].

Згодна з асноўным праграмным дакументам дадзенага камітэта — «Мемарыялам аб арганізацыі адбудовы ўсходніх крэсаў» — ставіліся больш шырокія задачы, не толькі эканамічныя («зрабіць крэсы эканамічнай перыферыяй Польскай дзяржавы»), але і сацыяльныя, палітычныя, культурна-асветніцкія. «Задачай Польскай дзяржавы на гэтых крэсах з’яўляецца іх далучэнне праз гаспадарчую і культурную адбудову. Гэты край здабыты напалову, следам за салдатам яго павінны канчаткова апанаваць дзяржаўныя чыноўнікі, адміністратары, настаўнікі, землеўладальнікі і тэхнікі» [26]. Першымі акцыямі, праведзенымі камітэтам на беларускіх землях, былі мерапрыемствы па забеспячэнні сенам і коньмі польскага войска.

Па дадзеным ГАР, у беларускіх паветах з 1 649 000 агульнай колькасці дзяцей 327 000 неабходна была дапамога. З Цэнтральнага камітэта дапамогі дзецям для беларускіх паветаў ГУУЗ было вылучана 186 000 марак [27]. У канцы 1919 г. на тэрыторыі ГУУЗ было ўтворана 29 апякунскіх радаў. Да канца студзеня 1920 г. на тэрыторыі ГУУЗ штодзённа выдавалася 114 450 порцый гарачага харчавання (22 718 порцый дарослым), пры падтрымцы рады працавала 137 дзіцячых дамоў (10 022 дзяцей), 380 сталовак на 56 405 дзяцей, 18 пунктаў акушэрскай дапамогі, 4 дзіцячыя шпіталі, 30 прытулкаў для дарослых на 1 291 чалавека, 47 пунктаў харчавання на 21 225 чалавек, 16 народных дамоў з чытальнямі.

Месячны бюджэт на гэтыя установы складаў 5 219 250 марак для дзяцей і 1 626 840 марак для дарослых (72% бюджэту ішло на дапамогу дзецям, 18% — на дарослых і 10% на ўтрыманне адміністрацыі). Асноўнымі крыніцамі даходаў ГАР з’яўляліся выплаты з Міністэрства працы і грамадскай апекі Польшчы (35%), з ГУУЗ (25%), з Міністэрства аховы здароўя (11%), з даходаў ад латарэй, ахвяраванняў, правядзення дабрачынных акцый (19%) [28].

Да красавіка 1920 г. ГАР атрымлівала ад польскага ўрада штомесячна 5 млн марак. Дзякуючы гэтай дапамозе, на тэрыторыі Польшчы і ГУУЗ было арганізавана 206 павятовых і 1 000 мясцовых радаў. Было створана 2 744 арганізацый апекі, з іх 2 315 — апекі над дзецьмі. Для ўтрымання усіх гэтых арганізацый у месяц патрабавалася 20 млн марак. З 1 красавіка дапамога ад Міністэрства працы і грамадскай апекі спынілася, арганізацыі, якія кантралявала ГАР, перадаваліся на ўтрыманне органаў самакіравання, якім урад збіраўся выдаваць дапамогу непасрэдна. З 1 чэрвеня 1920 г. спынілася фінансаванне і з ГУУЗ. Гэта прывяло да паступовага закрыцця ГАР і яе мясцовых арганізацый, некаторыя з якіх трымаліся толькі за кошт амерыканскай дапамогі. Самакіраванне рэальнай дапамогі аказаць не магло. З 1 снежня 1920 г. урад перадаў права праводзіць латэрэі Міністэрству скарбу, чым канчаткова паслабіў фінансавае становішча ГАР [29].

8 снежня 1920 г. згодна з распараджэннем Рады Міністраў пачалася ліквідацыя ГАР. 13 снежня афіцыйна спыніла дзейнасць цэнтральная адміністрацыя ГАР. Усё справаводства рады перадавалася Міністэрству грамадскай апекі, перадача кампетэнцыі дзяржаўным уладам цягнулася да 1 лютага 1922 г.

Рэпазіторый БарГУ

**Заключэнне.** У час польска-савецкай вайны на занятых польскімі войскамі беларускіх землях была створана разгалінаваная сістэма адміністрацыі, якая падпарадкоўвалася Грамадзянскаму ўпраўленню Усходніх зямель. Лёс гэтых тэрыторый заставаўся нявызначаным, таму палітыка польскіх улад мела непаслядоўны і спрэчны характар. Аналіз справаздач і ліквідацыйных рапартаў дае магчымасць зрабіць выснову аб тым, што польскія ўлады намагаліся зрабіць усё магчымае, каб атрымаць падтрымку насельніцтва на акупаваных землях: рабілі значныя саступкі ў сферы культуры і адукацыі, дазвалялі ствараць органы мясцовага самакіравання, сельскагаспадарчыя кааператывы, арганізоўваць апеку над насельніцтвам.

Сярод асаблівасцей палітыкі ГУУЗ можна вылучыць наступныя: поўная фінансавая залежнасць ад Польшчы з-за немагчымасці наладзіць падаткаабкладанне ва ўмовах ваеннага часу; паступовая замена мясцовых адміністратараў на чыноўнікаў з Польшчы, што не магло адбывацца без згоды вышэйшага кіраўніцтва ў Варшаве; большасць кіраўніцтва ГУУЗ былі прадстаўнікамі або прыхільнікамі Польскай нацыянал-дэмакратычнай партыі; падтрымка (у тым лікуі фінансавая) дзейнасці польскіх грамадскіх дабрачынных арганізацый; вылучэнне значных фінансавых сродкаў на арганізацыю і правядзенне плебісцыту, канчатковым вынікам якога прадугледжвалася жаданне мясцовага насельніцтва ўвайсці ў склад Польскай дзяржавы; фінансаванне пераважна польскага школьніцтва, адкрыццё толькі польскіх сярэдніх і прафесійных навучальных установаў; паступовы ціск на няпольскія навучальныя і культурна-асветныя ўстановы.

### Спіс цытуемых крыніц


1. Dziennik Urzędowy Generalnego Komisarza Cywilnego Naczelne Dowództwo W. P. Zarząd Wojskowy Ziem Wschodnich. № 3 (14 czerwca 1919). Roz. 1. 16.
2. DU ZCZW NDWP. № 5 (28 czerwca 1919). Roz. III. 39.
3. DU ZCZW NDWP. № 17 (12 wrżeśnia 1919). Roz. III. 153.
4. DU ZCZW NDWP. № 28 (11 listopada 1919). Roz. III. 303.
5. Peferat prasowy, listopad-grudzień 1919 r. W sprawie wschodnich granic Rżeczypospolitej (wydanie poufnie "Wschód polski") // BPW. DSDiR, ZCZW. Akc. 1762/1. K. 135—136.
6. Peferat prasowy, listopad-grudzień 1919 r. W sprawie wschodnich granic Rżeczypospolitej (wydanie poufnie "Wschód polski")// BPW. DSDiR, ZCZW. Akc. 1762/1. K. 137—138.
7. Sprawozdanie ogólne starostwa mińskiego, 13.08.1919—10.07. 1920 r.// BPW. DSDiR, ZCZW. Akc. 1684. K. 6.
8. Sprawozdanie o organizacji i dzialności tymczasowego zarżądu ziemskiego powiatu Mińskiego za czas wrżesień1919—czerwiec 1920 r. // BPW. DSDiR, ZCZW. Akc. 1865. K. 48.
9. Zestawenie dachodów i wydatków Tymczasowego Zarządu Ziemskiego napowiat Miński, wrżesień 1919—czerwiec 1920 r. // BPW. DSDiR, ZCZW. Akc. 1685. K. 50.
10. Sprawozdanie z dzialności referatu rolnego powiatu Mińskiego od dnia 20 sierpnia 1919 r. do 8 lipca 1920 r. // BPW. DSDiR, ZCZW. Akc. 1684. K. 23.
11. Sprawozdanie z dzialności referatu rolnego powiatu Mińskiego od dnia 20 sierpnia 1919 r. do 8 lipca 1920 r. // BPW. DSDiR, ZCZW. Akc. 1684. K. 23.
12. Sprawozdanie z dzialności referatu rolnego powiatu Mińskiego od dnia 20 sierpnia 1919 r. do 8 lipca 1920 r. // BPW. DSDiR, ZCZW. Akc. 1684. K. 23.
13. Sprawozdanie z dzialności lekarza powiatowego starostwa Mińskiego od dnia 20 sierpnia 1919 r. do 8 lipca 1920 r. // BPW. DSDiR, ZCZW. Akc. 1684. K. 22.
14. Sprawozdanie z dzialności lekarza powiatowego starostwa Mińskiego od dnia 20 sierpnia 1919 r. do 8 lipca 1920 r. // BPW. DSDiR, ZCZW. Akc. 1684. K. 22.
15. Sprawozdanie Naczelnika Okręgu Mińskiego za cały czas istnienia od 8.08.1919 r. do10.07.1920 r. // BPW. DSDiR, ZCZW. Akc. 1750. K. 8—11.
16. Справа з пратаколамі пасяджэнняў магістрата (жнівень 1919 — люты 1920 гг) // ДАМВ. Ф. 1806. Воп. 1. Спр. 4б. Арк. 65.
17. Zestawenie dachodów i wydatków Tymczasowego Zarządu Ziemskiego na powiat Miński, wrżesień 1919—czerwiec 1920 r. // BPW. DSDiR, ZCZW. Akc. 1685. K. 50.
18. Poufnie do SekcjiOPZCZW, 14 stycznia 1920 // BPW. DSDiR, ZCZW. Akc. 1750. K. 23—26.
19. Sprawozdanie Naczelnika Okręgu Mińskiego za całyc zasistnienia od 8.08.1919 r. do 10.07.1920 r. // BPW. DSDiR, ZCZW. Akc. 1750. K. 8—11.
20. Raport kierownika Działu Kulturalno-oświatowego Okręgu Mińskiego Strazy Kresowej Wacława Wierzbickiego za czerwiec 1920 r. // AAN. TSK. Akc. 213. K. 31—32.
21. Czym jest RGO. Historja, zadanja i zamiary RGO. Warszawa, 1919. // Archiwum Akt Nowych (AAN). RGO. Sygn. 231. Akc. 68—75.
22. Przeliminarży budżetowy wydziału prowincjonalnego RGO, 1919. // AAN. RGO. RGO. Sygn. 1030. Akc. 80.
23. Protkół RGO 29 maja 1919 r. // AAN. RGO. Syg. 24. Akc. 10.
24. Wniosek Generalnego Komisarza Cywilnegoprzy Wojskowym Zarządzie Polskich Ziem Wschodnichdo Rady Ministrów, kwiecień 1919. // AAN. RGO. Syg. 213. Akc. 1.
25. Korespondencja pow. Kobryński 1919—1920. // AAN. RGO. Syg. 496. Akc. 54.
26. Statut Komitetu odbudony Ziem Wschodnich 21 lipca 1919 r. // AAN. RGO. Syg. 46. Akc. 62—67.
27. Memorjał o państwowej organizacji odbudowy Kresow Wschodnich // AAN. RGO. Syg. 46. Akc. 76.
28. Cyrkularż doPowiatowzch Komitetów pomocy dla dzieci, 1919 r. // AAN. RGO. Syg. 88. Akc. 32—33.
29. Sprawozdanie z dzialności RGO za 1919 r. // AAN. RGO. Syg. 231. Akc. 9.


Рэпазіторый БарДУ